Літаратурнае падарожжа на паштовай картцы

**М. БАНДАРЭНКА**
бібліятэкар гарадской дзіцячай бібліятэкі мікрараёна "Маладзёжны", г. Мазыр



# Прыгоды кнігалюбаў-філатэлістаў на Радзіме і ў розных краінах свету

***Удзельнікі:*** вучні 3–6 класаў.

***Мэта:*** прывіваць любоў дзяцей да Радзімы і літаратуры на роднай мове, да багатай культуры Беларусі і іншых краін свету; праз знаёмства з філатэліяй пашыраць кругагляд дзяцей.

***Абсталяванне:*** кніжная выстава "Падарожжа паштовай маркі", падказкі дзеда Усяведа, альбом з маркамі, карта Беларусі, карта свету, клей-аловак, прэзентацыя "Вандроўкі па свету".

*Матэрыял для мерапрыемства падрыхтаваны па матывах аповесці-казкі Алеся Карлюкевіча "Прыгоды Максімкі на Бацькаўшчыне і ў розных краінах свету".*

### Ход мерапрыемства

**Бібліятэкар.** Добры дзень, дарагія мае сябры! Сённяшняя наша сустрэча — асаблівая. Дзякуй, што прыйшлі да нас у гэты цудоўны час — калі ўся краіна ўслаўляе беларускую і краязнаўчую кнігу! Пастараюся распавесці вам, якія падзеі чакаюць вас на старонках нашага мерапрыемства.

Не ведаю, як вы ставіцеся да вандровак, але мы, бібліятэкары,— вялікія іх аматары. Нават набылі сабе адмысловую карту-чытанку. На карце адзначаем маркамі розныя краіны свету, якія ў той ці іншы момант жыцця цікавілі нас і нашых чытачоў настолькі, што мы пачыналі чытаць аб іх вялікую колькасць самых розных кніг, часопісаў і энцыклапедый. Чаму маркамі? Проста так цікавей, не знаходзіце? Хаця, калі быць зусім дакладнай, такіх карт у нас дзве: адна — карта Беларусі, нашай роднай краіны, і другая — карта свету.

І зусім няважна, на якой карце марак апынецца больш, бо, нягледзячы ні на якую акалічнасць, мы ўсё ж лічым сябе вандроўнікамі па ўсім свеце. Бачыце, колькі ў нас тут кніг і розных часопісаў? І кожны жыхар кніжкінага дому можа расказаць пра самыя розныя куточкі свету. Часам на змену адным кнігам, якія займаюць сваё месца на кніжных паліцах, прыходзяць другія. Як лічыце, ад чаго гэта залежыць? (*Адказы дзяцей.*)

Скажыце, вас цікавіць, якога колеру вада ў возеры Байкал і ці можа чалавек пераплысці Ніл? Якія птушкі лятаюць над Памірам і колькі кіламетраў праходзіць па пустыні Каракум вярблюд без ніводнага глытка вады? А як жа можна даведацца пра гэта, не пабываўшы на возеры Байкал, ці ў пустыні Каракум? *(Адказы дзяцей.)* Так, з кніг! Прачытаўшы цікавую кнігу, натхніўшыся ёю, у думках можна падарожнічаць дзе заўгодна, нават на в'етнамскай лодцы па рацэ Меконг. Гэты занятак настолькі развівае ўяўленне, што нібыта сам стаіш каля Ніягарскага вадаспаду, сустракаешся сам-насам з белымі мядзведзямі і хаваешся за пальмай ад раз'юшанага слана…

Які прыемны занятак — падарожнічаць, адкрываць іншы, дагэтуль невядомы свет, нават не выходзячы з дому! Дапамагаць у гэтым могуць толькі кнігі — караблі чалавечай мудрасці. І крышачку — фантазія, што дазваляе ўявіць шырокія, бязмежныя тэрыторыі. Ці верыце вы, сябры, што часам жаданні і мары значаць не меней, чым здзейсненае і адкрытае? Зусім не абавязкова садзіцца ў самалёт і ляцець на другі кантынент. Часам лягчэй і цікавей існаваць у жыццёвай прасторы, калі ты валодаеш здольнасцю разгледзець увесь свет, ажыццявіць падарожжа да самых высокіх горных вышынь і самых глыбокіх акіянскіх упадзін. Няхай сабе — толькі ў думках…

А што вы скажаце, калі я запрашу вас у літаратурнае падарожжа на паштовай картцы? Ды і каму не хацелася б зменшыцца ў памерах настолькі, каб на паштовых марках адправіцца ў Эфіопію або Грэцыю, наведаць Белавежскую пушчу або Нясвіжскі замак? Што ж, гэта магчыма! Не верыце? А вы ўважліва слухайце, глядзіце, правільна адказвайце на пытанні дзеда Усяведа, і ён дапаможа нам гэта ажыццявіць! Будзе ў нас і свой экскурсавод і памочнік: хлопчык Максімка — галоўны герой аповесці-казкі Алеся Карлюкевіча.

*Знаёмства дзяцей з кнігай "Прыгоды Максімкі на Бацькаўшчыне і ў розных краінах свету".*

**Бібліятэкар.** Падарожжа пачынаецца! Адкажыце, калі ласка, хто з вас ведае, што такое філатэлія і каго называюць філатэлістамі?



**Падказкі ад дзеда Усяведа**

*Праца са слоўнікам.*

***Філатэлія*** — калекцыяніраванне і вывучэнне знакаў паштовай аплаты, дакументаў, звязаных з поштай. Узнікла ў Англіі, дзе ўпершыню з'явіліся паштовыя маркі, якія замянілі грашовую аплату за перасылку пісем. У Беларусі пашырана тэматычнае калекцыяніраванне паштовых марак. Упершыню беларускія паштовыя маркі выдадзены ў Латвіі ў 1920 годзе.

***Паштовая марка*** — спецыяльны знак, які выпускаецца і прадаецца нацыянальнымі паштовымі ведамствамі.



**ПАДАРОЖЖА Ў ЧАСЕ**

**Пра Беларусь расказваюць старыя паштоўкі.**

Знайдзіце беларускія маркі. Уважліва разгледзьце іх. Што вы на іх бачыце? Аб чым нам гавораць маркі? На адной з марак мы бачым намаляваны маёнтак Аляксандра Карлавіча Ельскага ў Замосці: звычайная, як па сённяшнім часе, драўляная хата. На другой — праваслаўная Пакроўская царква ў Дудзічах. На трэцяй — крыніца сядзібы Ельскіх.

Давайце размясцім на карце нашай краіны беларускія маркі.

Маркі бываюць самыя розныя, і ў маёй калекцыі іх толькі малая частка. Звернемся да прэзентацыі. Як бачыце, сярод беларускіх марак шмат партрэтаў з выявай беларускіх краязнаўцаў, падарожнікаў, географаў. Ёсць маркі, прысвечаныя Аляксандру Ельскаму, Ігнату Дамейку, Яўстафію Тышкевічу, Міколу Каспяровічу… Выдадзеныя ў розных краінах, яны ўжо экспанаваліся на розных выстаўках пад назвай *"Беларускія даследчыкі на знаках паштовай аплаты"*. А вам вядомыя гэтыя славутыя імёны нашых суайчыннікаў?

**Падказкі дзеда Усяведа**

***Ігнат Дамейка*** — геолаг, даследчык Чылі. Значную частку жыцця пражыў у Лацінскай Амерыцы. Арганізаваў вывучэнне геалогіі і мінералогіі Андаў, пустыні Атакама і правінцыі Араўканія на поўдні Чылі. Быў рэктарам універсітэта ў Сант'яга. Яго імем названы мінерал дамейкіт, фіялка, а таксама горад у Араўканіі.

***Яўстафій Тышкевіч*** — гісторык, археолаг, краязнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай навуковай археалогіі. Вывучаў старажытныя гарадзішчы ў Гальшанах, Друцку, Заслаўі, Слуцку, Мінску, Міры.

*Мікола Каспяровіч* — славуты беларускі краязнаўца, аўтар многіх кніг, прысвечаных арганізацыі работы па вывучэнні, даследаванні роднай старонкі. Быў адным з арганізатараў Цэнтральнага бюро краязнаўства ў 1920-я гады.

**Бібліятэкар.** А вось марка з выявай Нясвіжскага замку. Хто-небудзь быў там? Раскажыце пра свае ўражанні, а таксама аб тым, аб чым вы даведаліся пра Нясвіж і Нясвіжскі замак падчас экскурсіі. (*Адказы дзяцей, пошук інфармацыі ў кнігах на выставе, дапаўненні бібліятэкара.*)



**Падказкі дзеда Усяведа**

Упершыню Нясвіж згадваецца ў летапісах у 1446 годзе. У 1583 годзе было распачата будаўніцтва Нясвіжскага замка. Сярод вядомых нясвіжскіх помнікаў — Слуцкая брама, гарадская ратуша, Дом рамесніка, касцёл езуітаў, гарадская абарончая вежа...

Паглядзіце на марку з выявай Белавежскай пушчы.



*Расказ дзяцей пра Белавежскую пушчу, пошук інфармацыі ў кнігах на выставе, зварот да энцыклапедый Л. С. Мінкевіча "Самые необычные музеи Беларуси", "Города Беларуси".*

**Падказкі ад дзеда Усяведа**

***Белавежская пушча*** — найболей буйны лясны запаведнік, які, згодна меркаванняў вучоных, існаваў у Еўропе яшчэ ў дагістарычныя часы. Паступова ён быў высечаны і ў адносна некранутым выглядзе застаўся толькі ў Белавежскім рэгіёне на тэрыторыях сучасных Беларусі і Польшчы. У 1992 годзе Белавежскай пушчы рашэннем ЮНЕСКА нададзены статус біясфернага запаведніка.

У запаведніку налічваецца 59 відаў звяроў, 227 відаў птушак, 24 віды рыб. Самы буйны насельнік пушчы — зубр. Занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі.



*Знаёмства з той часткай Чырвонай кнігі, у якой узгадваецца пра зубра.*

*Знаёмства з маркамі Беларусі: серыя марак з выявай ягад, дрэў, кветак; параўнанне іх з такімі ж серыямі марак з Канады.*

*Знаёмства з маркамі на тэму "Выявы лялек і іншых вырабаў з саломы", зварот да энцыклапедыі народнага майстра Качан Г. К. "Лялькі: абярэгі, абрадавыя, гульнявыя"; размова аб ролі лялек у паўсядзённым жыцці нашых продкаў.*

## ВАНДРОЎКІ ПА ІНШЫХ КРАІНАХ СВЕТУ

### Кнігалюбы-філатэлісты адкрываюць Лацінскую Амерыку.

**Бібліятэкар.** Хочаце верце, хочаце не, але зараз мы з вамі адпраўляемся ў Лацінскую Амерыку! Венесуэла, Бразілія, Коста-Рыка, Перу... Здаецца, тое ж сонца, блакіт паднябесся зусім беларускі. І дубовы гай не горшы, чым на Гомельшчыне альбо Берасцейшчыне (*фотаздымкі на экране*). Ды нешта ўсё ж не тое... Згодны? Шыракалістая трава ростам вышэй за вашых бацкоў, а сярод лістоты, пранізанай сонечнымі промнямі ажно да празрыстасці, — некалькі велізарных какосаў (*фотаздымкі на экране*).

Філатэлістам гэтых краін ёсць чым ганарыцца. У *Бразіліі* першыя маркі былі надрукаваны 19 мая 1843 года. Гэтыя маркі па форме нагадвалі авал, і таму іх называлі "бычынымі вачыма". Наступныя выпускі называліся не менеи экзатычна — "казіныя вочы", "каціныя вочы".

Сярод марак знайдзіце маркі *Венесуэлы*, а потым адшукайце на карце гэтую краіну.

Маркі, што з'явіліся на *Кубе*, здавалася, прыносілі з сабою марскую прастору, зялёную лістоту дрэў і раслін, гарачыя шматколерныя малюнкі невядомай і далёкай краіны. Хаця, чаму невядомай? Пра Кубу можна даведацца столькі ўсяго цікавага з кніг! Як быццам у падарожжа выправіцца за многія тысячы міль ад Беларусі. І тады Матанзас, Гуантанама, Камагуэй і іншыя кубінскія гарады і гарадкі стануць не менеи знаёмымі, чым Нясвіж, Мазыр ці Брэст. Дарэчы, у сталіцы Коста-Рыкі — Сан-Хасэ — знаходзіцца музей філатэліі. Між іншым, адзін з нямногіх у свеце.

Сярод марак знайдзіце маркі *Кубы*, а потым адшукайце на карце гэтую краіну.

**Падказкі дзеда Усяведа**

*Праца са слоўнікам і энцыклапедыямі.*

***Куба*** — астраўная дзяржава ў паўночнай частцы Карыбскага мора. Сталіца — Гавана. Афіцыйная назва — Рэспубліка Куба. Неафіцыйна з 1959 года — Востраў Свабоды.

***Паштовыя маркі Кубы.*** Першыя маркі на востраве былі надрукаваны яшчэ тады, калі тэрыторыя з'яўлялася калоніяй Іспаніі, у 1873 годзе. Сёння паштовыя маркі Рэспублікі Куба — найцікавейшыя з паштовых мініяцюр.

**Бібліятэкар.** Зараз прапаную вам знайсці маркі з выявай Эфіопіі. Што вы на іх бачыце?

**Падказкі дзеда Усяведа**

***Эфіопія*** — дзяржава ва Усходняй Афрыцы. Не мае выхаду да мора.

***Маркі Эфіопіі.*** Першыя паштовыя маркі ў Эфіопіі былі надрукаваны ў 1894 годзе. Дакладней, друкавалі маркі для Эфіопіі тады ў Францыі, у Парыжы. У 1980 годзе пошта Эфіопіі выпусціла спецыяльныя серыі марак, прысвечаныя 22 Алімпійскім гульням у Маскве.

**Бібліятэкар.** На марках *Украіны, Расіі, Казахстана, Іспаніі, Грэцыі*, краін *Азіі* і *Афрыкі* можна ўбачыць адну і тую ж сапраўдную прыгажосць — чорнага бусла. Бусел і ў жыцці, і на марках лётае па ўсім свеце, усюды яму рады. Ён нібыта аб'ядноўвае людзей усяго свету!

**Падказкі дзеда Усяведа**

***Чорны бусел*** — птушка з сямейства бусліных. Занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі, Украіны, Расіі, Казахстана. Жывуць чорныя буслы і ў Афрыцы. Самая вялікая папуляцыя на тэрыторыі заказніка Званец у Беларусі.

**Бібліятэкар.** Што вы можаце расказаць пра чорнага бусла? (*Жывуць асобна, пазбягаюць людзей.*) Знайдзіце на выставе кнігі, прысвечаныя гэтай цудоўнай птушцы.

А цяпер паслухайце адну страшную гісторыю, якая здарылася даўным-даўно ў нашай старонцы. У Беларусі з аднаго пакалення ў другое перадаюць такі міф. Калісьці, даўным-даўно, чорны бусел быў белым і жыў побач з людзьмі, як і ўсе яго добрыя сябры — буслы. Ён быў на дзіва даверлівым, на людскую прыязнасць адказваў такой жа цеплынёй і дабрынёю.



Аднаму злому чалавеку не спадабаўся бусліны клёкат, і ён разбурыў гняздо, скінуў на зямлю буслянят, якія забіліся. Спазнаўшы неспадзяванае гора, буслы пакінулі вёску і паляцелі шукаць прытулак у пушчы. Яны пасяліліся на высокім дубе, каб толькі як мага далей быць ад людзей.

Вывеліся птушаняты, і яны былі белыя. Калі матуля расказала дзеткам, якой бяды нацярпеліся ад чалавека, малыя бусляняты апранулі на сябе жалобнае чорнае пер'е. З таго часу чорныя буслы жывуць толькі ў лесе. А ў нас, у Беларусі, як толькі могуць, ім дапамагаюць. Людзі жадаюць хаця б крыху замаліць правіну таго дзікуна. І называюць з таго часу чорных буслоў ляснымі манахамі.

Будзьце чулымі і ўважлівымі да птушак і жывёл, дапамагайце ім!

**Бібліятэкар.** Знайдзіце маркі *Аўстраліі.*

**Падказка дзеда Усяведа**

***Аўстралія*** — самы маленькі і самы плоскі з мацерыкоў Зямлі.

**Бібліятэкар.** Што адмысловага на марках Аўстраліі вы бачыце?

А зараз давайце пашукаем маркі часоў СССР. Якія з іх прысвечаны падзеям ваеннага часу, а якія — мірнага? Разкладзіце іх па групах:

- Спорт
- Свет, зямля, чалавек
- Ваенны флот
- Героі Вялікай Айчыннай вайны
- Эканоміка
- Палітыка
- Славутасці
- Мастацтва
- Прырода

Назавіце прозвішчы, назвы і гады змаганняў, аб якіх расказваюць нам маркі групы "Вялікія флатаводцы Расіі".

Паглядзіце на расійскія паштоўкі 1990-х гадоў. Як вы лічыце, яны адрозніваюцца ад савецкіх? Чым? Якія вам падабаюцца больш? Чаму? (*Адказы дзяцей.*)



***Літаратура***


1. Карлюкевіч, А. М. Прыгоды Максімкі на Бацькаўшчыне і ў розных краінах свету: аповесць-казка: для мал. шк. ўзросту / А. М. Карлюкевіч; мастак А. Б. Аракчэева.— Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2014.— 128 с.: іл.
2. Ермоленко, В. А. Первопроходцы дальних берегов. Уроженцы Беларуси в географических открытиях: для сред. и ст. шк. возраста / В. Ермоленко.— Минск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2015.— 64 с.: ил.— (История для школьников).
3. Вигилев, А. Н. Имя твое — коллекционер / А. Н. Вигилев.— М.: Радио и связь, 1981.— 94 с.: ил.— (Б-ка юного филателиста).
4. Гросс О. Путешествия в мир марок / О. Гросс, К. Грыжевский.— М.: Прогресс, 1977.— 266 с.
5. Чырвоная кніга Рэспублікі Беларусь: Рэдкія і тыя, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення віды жывёл і раслін / Беларус. Энцыкл.; Гал. рэдкал.: А. М. Дарафееў (старш.) і інш.— Мн., БелЭн, 1993.— 560 с.: іл.
6. Качан, Г. К. Куклы: обереги, обрядовые, игровые. Иллюстрированный мастер-класс / Г. К. Качан.— Минск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017.— 88 с.: ил.— (Энциклопедия народного мастера).
7. Минкевич, Л. С. Города Беларуси. Самые древние и самые молодые: для сред. и ст. шк. возраста / Л. С. Минкевич.— Минск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017.— 72 с.: ил.— (Белорусская детская энциклопедия).
8. Минкевич, Л. С. Самые необычные музеи Беларуси: для мл. шк. возраста / Л. С. Минкевич.— Минск: Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2017.— 72 с.: ил.— (Белорусская детская энциклопедия).




Паспрабуйце самастойна раскласці астатнія паштоўкі па тэматычных групах. **На марках якіх краін свету можна таксама знайсці птушак і кветкі?** (Беларусь, Кітай, Ізраіль, Швецыя, Ірландыя.)

**Якія яшчэ выявы на паштоўках былі характэрныя для Кітая, Швецыі, Ізраіля, Ірландыі**?

Уважліва паглядзіце на маркі, прысвечаныя спорту. Знайдзіце паштоўкі іншых краін свету, якія таксама распавядаюць пра спорт. Так, гэта маркі Экватарыяльнай Гвінеі. Гледзячы на іх, мы можам даведацца аб відах спорту, аб тых ці іншых спартсменах, пра Алімпійскія гульні, аб тым, дзе і калі яны праходзілі

Заданне: размяркуйце астатнія маркі па краінах свету, знайдзіце гэтыя краіны на карце, раскладзіце іх, адкажыце, да якіх тэматычных груп можна іх аднесці. (Германія, Балгарыя, Іспанія, Італія, Нідэрланды, Румынія, Латвія, Украіна, ЗША, Польшча, Канада.)

Малайцы, але хачу заўважыць: гэта не значыць, што толькі такая тэматыка ўласцівая паштоўкам гэтых краін. Проста менавіта такія ёсць у мяне. А якія маркі больш характэрныя для той ці іншай краіны, вы можаце даведацца з кніг, часопісаў, Інтэрнэту.




**Некалькі слоў на развітанне**

**Бібліятэкар.** Гледзячы на тое, як вы падчас гульні любаваліся на паштовыя мініяцюры быццам сапраўдныя філатэлісты – такія задуменныя і зацікаўленыя, – мне ўявілася, што перад вамі сапраўдная захапляльная цікавая кніга, і нават болей, чым кніга. Быццам мы з вамі пабывалі ў тых краінах, чые паштовыя маркі разглядалі. Альбо – у краіне ці горадзе, якім былі прысвечаны паштовыя мініяцюры.

А што будзе далей, залежыць толькі ад вас саміх і вашых думак. Адно спяшаюся заўважыць: вас зноў чакаюць вандроўкі, і не толькі па Беларусі. Хаця падарожнічаць па нашай краіне, шукаць прыгоды на Міншчыне ці на азёрнай Віцебшчыне, у Слоніме альбо на цудоўнай Мазыршчыне – занятак не меней захапляльны, чым знаёміцца з Амерыкай, Індыяй, іншымі краінамі свету. І трэба для гэтага не так ужо і шмат: чытаць кнігі – як мастацкую літаратуру, так і энцыклапедыі.

Прыемнага вам падарожжа!

Дазваляйце сабе марыць, паболей чытайце,
і тады ўсе вашы пажаданні здзейсняцца!




